Лабаноўскі Л. В.

# МІХАІЛ АНТОНАЎ: НА ВОГНЕННАЙ ДУЗЕ

Герой Савецкага Саюза Міхаіл Маісеевіч Антонаў нарадзіўся 11 сакавіка 1923 г. у Краснаполлі. Будучы яшчэ вучнем Краснапольскай сярэдняй школы, вырашыў ён стаць ваенным чалавекам. Кожны дзень яго школьнага жыцця быў запоўнены цікавымі заняткамі. Ён не толькі добра вучыўся, але і быў ініцыятарам і непасрэдным удзельнікам многіх пачынанняў у школе: то ён спяшаўся на пасяджэнне камітэта камсамола, то на заняткі гуртка Асавіяхіма, пярвічнай арганізацыі, якую ён узначальваў у школе. Зімой з захапленнем удзельнічаў у спаборніцтвах па лыжах, быў актывістам школьнай мастацкай самадзейнасці.

...Вайна грымнула раптоўна. Для камсамольца Міхаіла Антонава рашэнне было адно – на фронт. Ён заканчвае ваеннае танкавае вучылішча і для яго пачынаецца франтавое жыццё.

Адвага і мужнасць характарызавалі маладога камандзіра-танкіста. У1943 г. ён – удзельнік гістарычнай Курскай бітвы, тут праходзіла вогненная дуга з яе танкавымі бітвамі.

З 14 па 20 ліпеня ўзвод танкаў пад камандаваннем старшага лейтэнанта Антонава вёў упартыя і цяжкія баі пад Арлом. Чатыры разы танкісты атакавалі ворага, наносячы яму страты ў жывой сіле і тэхніцы. Асабіста Міхаіл Маісеевіч падбіў дзве самаходныя гарматы і гусеніцамі свайго танка раздавіў яшчэ адну.

А затым былі танкавыя контратакі ворага. Але праціўнік не дабіўся поспеху. У гэтым баі на сваім камандзірскім танку старшы лейтэнант Антонаў спаліў тры "фердынанды" і падбіў тры цяжкія танкі. Знішчана было пад гусеніцамі каля 40 чалавек пяхоты ворага. Контратака была сарвана. Левы фланг наступаючых савецкіх войск пад прыкрыццем танкістаў прасунуўся наперад і замацаваўся на новым рубяжы.

З 20 ліпеня Міхаіла Антонава як тактычна граматнага камандзіра назначаюць камандзірам 3-й танкавай роты.

І зноў баі на арлоўскай зямлі, каля Падмаслава і вёскі Казінкі, на бліжэйшых подступах да Арла. Тут Міхаіл Антонаў зноў не раз уступаў у бой з хвалёнымі "фердынандамі" і выходзіў пераможцам.

Да канца дня 3 жніўня 1943 г. 231-ы танкавы полк, у які ўваходзіла 3-я танкавая рота старшага лейтэнанта Антонава, падышоў да бліжніх подступаў усходняй ускраіны Арла.

Перад палком, а таксама часцямі 5-й стралковай дывізіі была пастаўлена задача заваладаць горадам. Сем разоў у раёне вёскі Кафанава вадзіў храбры камандзір сваю 3-ю роту ў атаку. Асабіста Міхаіл Антонаў знішчыў 6 кулямётных кропак і каля ўзвода

праціўніка, у раёне сяла Альхавец знішчыў 6 мінамётаў разам з прыслугай. На бліжэйшых рубяжах каля Арла, у раёне лесапільнага завода 3-я танкавая рота зноў вяла цяжкі бой. Уперадзе быў камандзір, які на сваім танку раздавіў 4 гарматы, спаліў 3 аўтамашыны і знішчыў вялікую колькасць жывой сілы ворага.

Раніцай 4 жніўня 1943 г. танкісты прарваліся на пярэдні край абароны немцаў. Нягледзячы на моцны агонь ворага, камандзір павёў роту ў бой. Ён змятаў усё на сваім шляху, душыў гусеніцамі фашыстаў і прасоўваўся ў напрамку іпадрома. Бой ішоў зноў на ўскраінах Арла. Танкавая рота Міхаіла Антонава пракладвала шлях для пяхоты, якая ўжо з крыкам "Ура!" уступала ў горад. І ў гэты час па левым борце камандзірскай машыны залпам ударылі фашысцкія супрацьтанкавыя гарматы. Полымя ахапіла танк...

Міхаіл Антонаў загінуў смерцю храбрых, яму тады было 20 гадоў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 жніўня 1943 г. нашаму земляку Міхаілу Маісеевічу Антонаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна). На яго магіле ў горадзе Арол устаноўлены бронзавы бюст. Памяць аб ім жыве і на роднай краснапольскай зямлі. Імя Міхаіла Антонава прысвоена Краснапольскай сярэдняй школе № 1, у якой ён некалі вучыўся, тут жа ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Яго імем у райцэнтры названа вуліца, а ў Казані – школа-інтэрнат. У гісторыка-краязнаўчым музеі Краснапольскай сярэдняй школы яму прысвечана экспазіцыя.

**Лабаноўскі, Л. В. Міхаіл Антонаў: на вогненнай дузе / Л. В. Лабаноўскі // Землякі : гісторыя Краснапольшчыны ў асобах / Л. В. Лабаноўскі — Мазыр, 2004. — С. 118—120.**